ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 183 (1452) | НЯДЗЕЛЯ, 9 жніўня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

Сёньня чырвонае ўсенароднае галасаваньне ў Прусіі

Компартыя мобілізуе працоўныя масы ў барацьбе за рабоча-сялянскі ўрад

За чырвоны плебісцыт

Сёньня ў буйнейшай частцы Нямеччыны-Прусіі, якая складае 2-3 краіны, прызначана ўсенароднае галасаваньне па пытаньню роспуску прускага ляндтагу (парляманту).

На чале прускага аб'яднанага ўраду стаіць вядомы соцыял-дэмократ Отто Браўн і міністар унутраных спраў Зэвэрынг, а ў склад ураду ўваходзіць прадстаўнікі партыі, цэнтру, дзяржаўнай народнай дэмократычнай партыі і соцыял-дэмократыі. Вясною 1931 году фашысцкая організацыя „Сталёвы шлем“ патрабавала ўсенароднага галасаваньня за роспуск прускага ляндтагу. Гэта фашыстым патрабвалася дзеля таго, каб захапіць у свае рукі міністэрскія портфэлі, каб яшчэ больш пашырыць формы эксплёатацыі працоўных у імя захаваньня капіталістычнага ладу, у імя ратаваньня Нямеччыны ад разьядаючага эканомічнага крызісу. У выніку таго, што фашыстым удалося сабраць патрэбны лік галасоў, прускі ўрад вымушан быў прызначыць гэта ўсенароднае галасаваньне на 9-га жніўня.

Ужо сама мэта, якую паставілі перад галасаваньнем фашыстыя з выстарчальнай яснасьцю акрэсьлівае іх контррэволюцыйныя намеры. Для нас зусім зразумела, што перамена портфэляў у прускім урадзе ніколькі не азначае, як-бы аб гэтым ні сьпявалі фашыстыя, якога-небудзь палепшаньня становішча рабочае клясы. Палепшаньне становішча заложана не ў парляманцкай барацьбе, як гэта мысьляць соцыял-дэмократы, гэтыя здраднікі рабочае клясы і лёкаі буржуазіі, але ў зьвяржэньні існуючага ладу капіталістых, фашыстых і соцыял-фашыстых.

Комуністычная партыя Нямеччыны ў сувязі з прызначэньнем усенароднага галасаваньня, разгарнула шырокую масавую работу за чырвоны плебісцыт (чырвонае ўсенароднае галасаваньне). Компартыя стала на чале руху шырокіх пролтарскіх мас працоўнага сялянства Прусі за роспуск буржуазнага ўраду ў Прусіі і стварэньне ўраду рабоча-сялянскага.

Гэты рух прыняў шырокія, пагражаючыя для буржуазіі памеры. Зусім не выпадкова соцыял-дэмократычная поліцыя мобілізавала супроць яго свае сілы. А бэрлінскі поліцэй-прэзыдэнт Гржэзінскі пры міністэрстве ўнутраных спраў склікаў нават спэцыяльную нараду аб узброеньні поліцыі і падрыхтоўцы да 9-га жніўня.

Зараз для нас зусім відавочны адзіны фронт ураду, фашызму і соцыял-фашызму супроць чырвонага плебісцыту.

Гэта кампанія за чырвоны плебісцыт, на чале якое стаіць компартыя Нямеччыны, мае вялікае палітычнае значэньне ў справе далейшай мобілізацыі пролетарскіх і працоўных мас за соцыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, супроць ураду фашысцкай дыктатуры, супроць яго апоры—соцыял-фашыстых.

Зусім не выпадковы той рэволюцыйны ўздым, якім спадарожваецца гэта кампанія. Гэты ўздым выяўляецца ў прытоку новых рабочых у комуністычную партыю, моладзі ў комсамол і ў павялічэньні выхаду соцыял-дэмократычных рабочых з сваіх партый.

Вызваленьне працоўных Нямеччыны з-пад уціску буржуазіі і заменжага імпэрыялізму магчыма толькі праз пролетарскую рэволюцыю. За гэтую рэволюцыю компартыя і вядзе шырокія працоўныя масы.

Усеагульная забастоўка у Сэвільлі

МАДРЫД. 7.—У Сэвільлі працягваецца ўсеагулчная забастоўка. Настрой рабочых вельмі ўзбуджаны. З солідарнасьці к рабочым забаставалі таксама сельска-гаспадарчыя рабочыя раду вёсак. У Алжэзірасе працягваецца ўсеагульная забастоўка. У Барсэлёне разбурана адна тэлефоная пабудова. В Саррагасе амаль ва ўсім горадзе тэлефонная сувязь бязьдзейнічае. У Барсэлёне, у сувязі з забастоўкай грузчыкаў наглядаецца недахоп харчоў. У Валенсіі забаставалі рабочыя консэрвнай фабрыкі. У Кордове забастоўка на цукровым заводзе закончылася перамогай рабочых. Прадпрыемцы згадзіліся павысіць зарплату. У Хуэльве бастуюць маракі.

Друк адзначае, што беспрацоў'е прыняло трагічныя памеры. Многія рабочыя жабруюць, каб даць харчаваньне сваім дзецям. Каталёнскія прамыслоўцы патрабуюць зьніжэньня заработнай платы.

Новае банкроцтва банкаў

НЬЮ-ЁРК. 6. У Нью-Джэрсі абанкруціліся чатыры буйныя банкі, капітал якіх раўняецца ў агульнай складанасьці 11-ці мільёнам доляраў.



Сутычка рабочых з паліцыяй.
На здымку: рабочыя разбройваюць паліцэйскіх (ПАЗШ)

Забойства тэкстыльшчыкаў у Бомбею

ЛЕНДАН. 7. з Бомбэю тэлеграфуюць, што забастоўка 30 тыс. тэкстыльшчыкаў у Шалапуры, абвешчаная два тыдні таму назад, працягваецца з ранейшай настойлівасьцю. Спробы прадпрыемцаў правесьці скарочаньне зарплаты вызываюць супраціўленьне рабочых і ў іншых тэкстыльных цэнтрах Індыі. Сёньня, у Бэнарэсе забаставалі 3 тыс. тэкстыльшчыкаў. Забастоўку супроць скарачаная зарплаты абвясьцілі таксама 3 тыс. тэкстыльшчыкаў у Калькуце.



Дэмонстрацыя рабочых у Ангельшчыне.

10-га жніўня па Менску праводзіцца дзень дапрызыўніка 1909 г. нараджэньня, з мэтай масавай праверкі праведзенай працы і завастрэньня ўвагі на задачы, якія стаяць перад прызыўнікамі ў час прызыву.

На ўсіх прадпрыемствах Менску ў час абедзеных перапынкаў павінна на лятучых мітынгах правярацца праробленая праца сярод дапрызыўнікаў.

А 7-й гадзіне ўвечары ўсе комсамольскія колектывы, сумесна з дапрызыўнікамі 1909 г. нараджэньня і рабочае моладзі, організаваным парадкам зьбіраюцца ў сад „Профінтэрн“ на масоўку.

К XVII МЮД'у дабіцца пералому у ваенізацыі

Выхад з пячуванага крызісу капіталістычныя дзяржавы бачаць у інтэрвэнцыі, у вайне супроць Савецкага Саюзу. Падрыхтоўку да гэтай вайны яны вядуць шпаркімі тэмпамі. Возьмем, напрыклад, нашу бліжэйшую суседку Польшчу. Эканомічны крызіс усё больш паралізуе прамысловасьць і сельскую гаспадарку гэтай краіны, але ён ніколькі не закрануў тых прадпрыемстваў, якія працуюць на ўзброеньне, на падрыхтоўку будучай вайны. 40 проц. бюджэту Польшчы ідзе на ўзброеньне.

Аб гэтым ніколі не павінен забываць комсамолец, у асаблівасьці комсамолец Савецкай Беларусі.

Мацаваць абароназдольнасьць краіны, быць падрыхтаваным,—баявая задача УсеЛКСМ і ў асаблівасьці комсамолу Беларусі.

Таму IX-ты зьезд УсеЛКСМ і X-ты зьезд ЛКСМБ так завастрыў пытаньне аб ліквідацыі вайсковай няпісьменнасьці сярод комсамольцаў, аб палепшаньні вайсковай работы ў комсамольскіх організацыях. Мінула больш паўгода пасьля работы зьезду. Аднак, большасьць організацый дрэнна выконвае пастановы зьездаў аб ваенізацыі. Гэта адзначыў і прадапошні, 2-гі пленум ЦК ЛКСМБ. Ня гледзячы на пастанову другога пленуму аб тым, што адзінай формаю вайсковага навучаньня комсамолу павінны стаць вайсковыя навучальныя пункты, нашы організацыі, за выключэньнем адзінак, як Бабруйская гэтага ня выканалі.

Саматужніцтва, гурткоўшчына ў вайсковым навучаньні, дамінуюць ня толькі у вясковых організацыях, але і ў організацыях такіх буйнейшых прамысловых цэнтрах, як Менск, Барысаў і інш.

Па многіх раёнах вайсковая вучоба комсамолу зусім правалена. У гэтым часьцяком вінаваты ня толькі комсамольскія організацыі а і Асоавіяхэмаўскія. Яны бязьдзейнічаюць, нічым не дапамагаюць комсамолу наладзіць гэтую важнейшую справу. У Чачэрскім раёне баявыя адзінкі, організаваныя комсамолам развальваюцца, дзякуючы таму, што РСА АСО не забясьпечыў іх кіраўнікамі, вінтоўкамі і іншым.

Дапусьціць гэтага нельга ў далейшым.

Жнівень — ударны месяц у падрыхтоўцы да 17-га МЮД'у—павінен стаць ударным ў ваенізацыі комсамолу.

Нашы організацыі павінны зараз-жа ўключыцца у месячнік самаправеркі вайсковых ведаў комсамольцаў абвешчаны ЦК УсеЛКСМ і Цэнтральным Саветам Асоавіяхэму. Гэты месячнік павінен пачацца 10-га жніўня і скончыцца 6-га верасьня, у дзень 17-га МЮД'у.

Асноўныя задачы месячніка праверыць усваеньне усімі комсамольцамі програмы І-й і ІІ-й ступені; перабудаваць сыстэму вайсковай падрыхтоўкі комсамольцаў на 100 проц. ахапіць комсамольцаў і шырокія масы беспартыйнае працоўнае моладзі усімі відамі вайсковай вучобы; падрыхтаваць з тых комсамольцаў, якія добра усвоілі програму першай і другой ступені камандзіраў малодшага і сярэдняга складу.

Выкананьнем гэтых задач комсамол Беларусі пакажа сваю здольнасьць драцца за ўдзел у варашылаўскіх манэўрах, за ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны.

З 10-га жніўня па 6-е верасьня месячнік самаправеркі ваенізацыі

Драцца за пуцёўкі на варашылаўскія манэўры

Праверым вайсковыя веды комсамольцаў

Усім організацыям і ячэйкам комсамолу і АСОАвіяхэму

Вайсковы аддзел ЦК УсеЛКСМ і ЦК АСОАвіяхэму, падтрымліваючы прапанову І-й роты вайскова-вучэбнага пункту № 1 і 9 роты 3 вайскова-вучэбнага пункту Кастрычніцкага раёну Масквы (зьмешчаную ў газэце „Комсамольская Правда“ ад 1 жніўня, № 210-1943), аб правядзеньні месячніка падрыхтоўкі комсамольцаў,—прапануюць *організацыям і ячэйкам комсамолу і АСОАвіяхэму з 10 жніўня па 6 верасьня, да XVII МЮД, правесьці праверку вайсковых ведаў усіх камсамольцаў з шырокім прыцягненьнем да беспартыйнай моладзі:*

а) праверыць усваеньне програмы 1 і 2 ступені вайсковай падрыхтоўкі ўсімі, хто абучаецца вайсковай справе і ступень вайсковай падрыхтоўкі неахопленых вайсковым навучаньнем;

б) узяць усіх комсамольцаў і беспартыйную моладзь, якія прайшлі праверку вайсковых ведаў, на асобы вучот і ў адпаведнасьці з іх вайсковымі ведамі, месячнік праверкі разгарнуць падрыхтоўчую работу да ўдзелу ў манэўрах РСЧА і організацыі зімовых вайсковых ведаў;

в) з лепшых комсамольцаў, веды якіх у выніку праверкі будуць адпавядаць програме 2 ступені, організаваць спэцыяльныя віды вайсковай падрыхтоўкі, школы і курсы па падрыхтоўцы малодшага і, з комсамольцаў з сярэдняй асьветаю,—сярэдняга комскладу ўсіх родаў войск;

г) організацыям, якія не перабудавалі сыстэмы вайсковай падрыхтоўкі, месячнік праверкі вайсковых ведаў комсамольцаў увязаць з перабудовай вайсковай вучобы, з організацыяй сеткі навучальных агульнавайсковых і па спэцыяльным відам пунктаў вайсковай падрыхтоўкі.

Правядзеньне месячніка праверкі вайсковых ведаў комсамольцаў павінна спадарожвацца шырокай агітацыйна-масавай работай за большае ўцягненьне комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў сыстэму вайсковай падрыхтоўкі АСОАвіяхэму, за палепшаньне якасьці вайсковай падрыхтоўкі, паказам лепшых узораў вайсковай вучобы, лепшых ударнікаў баявой падрыхтоўкі і прэміяваньнем іх.

Вынікі правядзеньня месячніка праверкі вайсковых ведаў не пазьней 15 верасьня павінны быць прадстаўлены ў ЦК УсеЛКСМ і ЦС АСОАвіяхэму.

Заг. вайсковым аддзелам ЦС Гаршэні.
Заг. вайсковым адз. ЦК УсеЛКСМ АСОАвіяхэму Міленаў.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў вайсковай работы

Комсамольскія ячэйк Брагінскага р-ну пастаноў IX і X зьезду аб ліквідацыі вайсковай няпісьменнасьці сярод комсамольцаў ня выконваюць. Ні адна ячэйка ня мае гуртка па вывучэньню вайсковай справы.

Большасьць ячэек нічога не зрабіла для таго, каб растлумачыць сутнасьць і рэалізаваць пастановы зьездаў аб шэфстве над паветрача-морскім флётам.

Разьвёрстка ЦК ЛКСМБ на пасылку комсамольцаў у авіяцыйныя школы ня выконваецца. У гэтым вінаваты райком ЛКСМБ, які не давёў разьвёрстку да ячэек.

Таксама нічога ня робіцца для збору сродкаў на пабудову падводнай лодкі „Комсамолец Беларусі“ і зьвяна самалётаў.

РК ЛКСМБ не зварочвае ніякай увагі на выкананьне пастаноў зьездаў аб ліквід. вайск. няпісьменнасьці.

А. Данчанка.

Адкрыты ліст ЦК ЛКСМБ „Чырвонай Зьмены“

IX зьезд УсеЛКСМ у сваіх пастановах падкрэсьліў: „у сувязі з узмацненьнем небясьпекі інтэрвенцыі супроць СССР, комсамольская організацыя ў цэнтр увагі павінна паставіць задачу ўзмацненьня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу і ахапіць 100 проц. комсамольцаў вайсковай вучобай.

Чачэрскі РК ЛКСМБ, абмеркаваўшы пастанову зьезду аб ваенізацыі, вылучыў члена бюро РК адказным за гэту справу і прапанаваў усім комсамольскім ячэйкам зараз-жа організаваць пры кожнай ячэйцы вайсковую адзінку. У выніку—на Чачэрскім р-не організаваны чатыры комсамольскія адзінкі, якія ахапілі больш 200 комсамольцаў. Гэтыя адзінкі распачалі сваю працу і мелі добрыя паказчыкі ў ліквідацыі вайсковай няпісьменнасьці комсамольцаў.

Але райсавет Асоавіяхэму не дапамог РК ЛКСМБ у пачатай ім рабоце па ваенізацыі, дык зараз наглядаецца значнае паслабленьне і адсеў комсамольцаў з гэтых адзінак. Комсамольскія адзінкі ня маюць сваіх кіраўнікоў. Райсавет Асоавіяхэму ня вылучыў ніводнага з камандзіраў запасу, а іх у р-не 20 чал., кіраўнікамі гэтых адзінак. Таксама не забяспечыў адзінкі вінтоўкамі і адпаведнай ваеннай літаратурай.

Такое становішча не дае магчымасьці нашай організацыі выканаць рашэньні IX і X зьездаў па ваенізацыі. Таму Чачэрскі РК ЛКСМБ зварочваецца да ЦК ЛКСМБ і рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ з просьбай аказаць садзейнічаньне ў наладжаньні вайсковай вучобы.

Сэкратар Чачэрскага РК ЛКСМБ
Эцін.

Ад рэдакцыі:

Мы лічым недапушчальнымі адносіны РС АСО Чачэрскага раёну да такой важнейшай справы, як вайсковае навучаньне комсамолу.

РС АСО Чачэрскага раёну павінен неадкладна забясьпечыць вайсковыя комсамольскія адзінкі кіраўнікамі, вінтоўкамі і іншымі вайсковымі прыладамі.

ЦС АСО павінен прыцягнуць да адказнасьці кіраўнікоў РС АСО за такія адносіны да вайсковага навучаньня комсамольцаў.

50 новых байцоў—„самай вострай, самай моцнай зброі партыі“

ВЫКАНАЦЬ З ГОНАРАМ ЗАДАЧЫ, УСКЛАДЗЕНЫЯ ПАРТЫЯЙ І КОМСАМОЛАМ

Пасьпяхова скончылі сваю працу каротка-тэрміновыя курсы пры Культпропе па падрыхтоўцы работнікаў для раённых газэт.

Сёньня кадры работнікаў бальшавіцкага друку папаўняюцца новым атрадам „50“. Гэта яшчэ адна перамога на шляху ўмацаваньня нізавога друку і перабудовы рабселькораўскага руху.

50 мобілізаваных лепшых комсамольцаў юнкораў-ударнікаў накіроўваюцца на сталую працу ў якасьці сэкратароў і інструктароў масавай працы ў раённых газэтах.

За кароткі час вучобы курсанты атрымалі шмат новых ведаў: у асноўным вывучылі традыцыі бальшавіцкага друку, добра засвоілі тое, што гаварылі правадыры нашае партыі—Ленін і Сталін—аб друку, праслухалі цыкль лекцый „Друк у барацьбе за соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі“, прапрацавалі прамову тав. Сталіна, рашэньні апошніх пленумаў ЦК УсеКБ(б) і ЦК КП(б)Б, вынікі кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ.

Група выпуснікоў; верхні рад—т. т. Белько Гарэлік і Марчанка ніжні рад—т. т. Крніца, Гулько і Кузьмянок

Курсанты ўсвоілі, як трэба паставіць гаспадарча-палітычную работу на вёсцы ў сувязі з новай абстаноўкай, новымі задачамі, якія стаяць перад намі на новым этапе.

Прапрацоўка рашэньняў усесаюзнай нарады аб рабселькораўскім руху, вынікі ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду далі курсантам асноўныя разуменьні аб тым, як трэба перабудаваць рабселькораўскую працу на сёньнешні дзень. Праведзенныя пры дапамозе і пад кіраўніцтвам паўпрэдства газэты „Правда“ вопытныя рэйды ўдарных брыгад, практыка ў цэнтральных газэтах, дзе курсанты самі рыхтавалі падборкі, вярсталі газэту і г. д., далі ім разуменьне, як трэба практычна організоўваць ударныя брыгады, рэйды, як жыве і выпускаецца газэта.

Прыехаўшы на працу ў раёны, пры дастатковай, сыстэматычнай працы над сабою, курсанты, бязумоўна змогуць наладзіць нізавы друк, перабудаваць рабселькораўскі рух так, як гэтага патрабуе партыя.

Курсанты выпускнікі, 50 байцоў на фронце друку!

Будзем спадзявацца, што вы поўнасьцю спр...цеся і выканаеце тыя задачы, якія ўскладае на вас партыя.

Падрыхтуем кадры комсамольскаму друку

Дырэктывы партыі аб падрыхтоўцы бальшавіцкіх кадраў друку баявая задача дня.

Рост раённых газэт, шматтыражак гораду і вёскі з кожным днём настойлівей ставіць перад намі ва ўсю шыр пытаньне аб укомплектаваньні іх бальшавіцка-вытрыманымі працаўнікамі.

Мы павінны падрыхтаваць кадры, якія-б мелі організатарскія здольнасьці і змаглі-б баявымі тэмпамі, па бальшавіцку організоўваць масы на вырашэньні асноўных задач соцыялістычнага будаўніцтва.

За апошні час для рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб газэтных кадрах праведзены рад мерапрыемстваў. Газэтнае аддзяленьне Комвузу імя Леніна пашырана з 24 асоб да 75. У 1931-32 годзе мяркуецца ўкомплектаваць яго 175 асобамі. Організаваны газэтныя аддзяленьні пры Гомельскай саўпартшколе, Магілеўскім політасьветтэхнікуме і г. д.

Але мы зусім яшчэ мала займаемся падрыхтоўкаю і перападрыхтоўкаю газэтных кадраў для комсамольскага друку. Пастаўленае ЦК ЛКСМБ перад комсамольскімі організацыямі, пытаньне аб маладзёжных старонках пры раённых газэтах і шматтыражках з усёй яскравасьцю высоўвае неабходнасьць падрыхтаваць належныя кадры для комсамольскага друку.

Неабходна пры гадовых курсах у новым навучальным годзе організаваць газэтнае аддзяленьне на 30 чалавек. У Менску, Гомелі і Віцебску неабходна організаваць пры вячэрніх комвузах комсамольскія газэтныя аддзяленьні, а таксама завочную вучобу комсамольцаў. На старонках „Чырвонай Зьмены“ пэрыодычна даваць програмна-мэтодычныя ўказаньні, альбо організаваць пры ёй завочныя курсы па падрыхтоўцы комсамольцаў газэтных работнікаў.

Распачаць зараз-жа ўкомплектаваньне газэтных—аддзяленьняў, ударнікамі-юнкорамі, распрацаваць програмы, навучальныя пляны, падабраць выкладчыкаў і г. д.

Б. З.

Набыты вопыт падмацавалі тэорэтычнымі ведамі

За кароткі тэрмін навучаньня курсы далі больш-менш падрыхтаваных новых газэтных работнікаў.

Шляхам разгорнутага соцспаборніцтва і ўдарніцтва програмны матар'ял прапрацаваны курсантамі грунтоўна, курсанты ў асноўным будуць ведаць аб значэньні друку ў рэконструкцыйны пэрыод.

Заняткі на курсах скончыліся. Маючы папярэдні вопыт юнкораўскай працы і падмацаваўшы яго практычна-тэорэтычнымі ведамі, курсанты можна з упэўненасьцю сказаць, з ускладзенымі на іх партыяй і комсамолам задачамі з посьпехам справяцца.

Ермакоў, Кугель, Прасьцякоў. Протчанка, Гарэлаў, Шындлоўскі, Ге шман.

Новыя кадры бальшавіцкаму друку

За кароткі тэрмін курсы далі нам шмат карысьці. Тыя дысцыпліны, якія былі ўведзены на курсах, добра засвоены.

50 комсамольцаў актывістых рабочых і колгасьнікаў уліваюцца ў колёны барацьбітоў на адзін з адказнейшых фронтаў соцыялістычнага будаўніцтва. Атрыманыя тэорэтычныя веды мы замацавалі на практыцы ў цэнтральных газэтах „Чырвонай Зьмена“ дала нам магчымасьць азнаёміцца з працаю сэктароў і афармленьнем юнкорускіх допісаў. За што брыгада ў ліку 6-ці асоб, якая адбывала практыку ў „Чырвонай Зьмене“, выносіць шчырую падзяку рэдакцыі за аказаную дапамогу.

Пучінскі, Вылягар, Кабак, Трацэўскі Эйтліна Цэвелеў.

На барацьбу за тэхніку газэтнай справы

Яшчэ будучы ў сямігодцы, я ў першы раз напісаў заметку ў сваю насьценгазэту. Заметка была зьмешчана. Гэта і пацягнула мяне стаць юнкорам. З таго часу адна за адной зьмяшчаліся мае заметкі на старонках насьценгазэты. Але мяне цікавіла адно: чаму заметка, напісаная мною на цэлым аркушы паперы, зьмяшчалася ў пяць-дзесяць радкоў.

Начала выходзіць раённая газэта „Барацьбіт за колектывізацыю“. Я таксама стаў пісаць у яе. За тры гады я шмат чаму навучыўся, упрасьціў сваю мову і ўжо мае заметкі не скарачаюцца як раней, бо вады ў іх стала меней.

К. Кабак.

ДЭЗЭРТЫРЫ

ЦК ЛКСМБ былі мобілізаваны комсамольцы на курсы раённых газэтных работнікаў у лік „50“.

Сярод мобілізаваных аказаліся дэзэртыры; Данілаў (Аршанскі раён) Венедзіктаў Б. (Круглянскі раён), і Сокалаў А. (Крычаўскі р-н). Прыехаўшы на курсы, яны пабылі некалькі дзён, пакуль атрымалі грошы за праезд і талёны на харчаваньне потым цэлы месяц дэзэртыравалі.

ЦК ЛКСМБ, Аршанскаму Круглянскаму і Крычаўскаму райкомолам неабходна прыняць тэрміновыя меры да комсамольцаў, якія дэзэртавалі з адказьнейшага фронту соц.будоўлі,—з фронту барацьбы за соцыялістычнае будаўніцтва.

Выпускнік курсаў

Да 17 МЮД'у

Баявы агляд рэвалюцыйнай моладзі

Міжнародны юнацкі дзень, які ўзьнік ў чорныя дні імпэрыялістычнай бойні заўсёды быў сьвятам баёў, днём баявых пролетарскіх выступленьняў, праверкай клясавай баяздольнасьці маладога пролетарыяту. У апошнія гады, зьвязаныя з крызісам, баявая актыўнасьць комуністычнае моладзі выбухла з новаю сілаю, і XV і XVI МЮД прайшлі ў абставінах гарачых клясавых сутычак, якія даходзілі у некаторых краінах да непасрэдных баявых сутычак з паліцыяй.

XVII МЮД у гэтых адносінах, бясспрэчна зойме выключнае месца ў сувязі з агульным абвострэньнем крызісных абставін, нарастаньнем рэволюцыйнага крызісу, надзвычайнай напруджанасьцю сучасных клясавых боек на Захадзе. Рабочая моладзь у асаблівай ступені адчувае на сваіх плячох даўленьне крызісу рацыяналізатарскага націску, прадпрыемчага наступу.

Ужо адзін той факт, што амаль ва усіх краінах капіталу беспрацоўная моладзь пазбаўлена усякіх надзей на дапамогу, сьведчыць аб тэй агромністай патрэбе, якую адчувае малады пролетарыят пад ўдарамі крызісу. Мільённыя арміі беспрацоўных падлёткаў у Нямеччыне, Польшчы, Англіі, Амэрыцы фактычна кінуты на голад, недаяданьне, на бяспраўнае становішча людзей, якія могуць разьлічваць выключна на прыватную дабрачыннасьць — дробныя падачкі са стала гаспадара.

Але становішча моладзі, якая працуе на прадпрыемствах крыху лепшае за становішча беспрацоўных. Адно з абследваньняў у Бэрліне ўстанавіла, што амаль трэцяя частка занятых на працы падлеткаў ня мае ложак, спальных прылад, зьмены бялізны, ня мае свайго кута і вымушана жыць у самых нечалавечных жыльлёвых умовах. Другое абследваньне паказала, што 30 проц. рабочае моладзі Нямеччыны зарабляе менш 40 марак у тыдзень, другімі славамі—7 р. 50 к. у месяц, менш нават дапамогі беспрацоўнаму у той самай Нямеччыне. Сем мільёнаў рабочае моладзі Нямеччыны ня ведаюць, што такое адпачынак. Гэта трэцяя частка усяе моладзі Нямеччыны. Але і так званы „адпачынак“, які даецца рабочаму падлетку найбольш жаласьлівымі прадпрыемцамі, ёсьць на справе самы насумлены зьдзек над адпачынкам. Максімальны працяг такога „адпачынку“ 3-4 дні. Вось на што растрачваюцца ва ўмовах капіталістычнай эксплёатацыі „палкія дні юнацтва“. Няма нічога дзіўнага у тым, што рабочыя падлеткі на капіталістычных прадпрыемствах выглядаюць старэнькімі нейкімі не пасьпеўшымі разьвіцца і адразу ўпаўшымі ў стан старэчы дзецьмі.

Калі такое становішча у Нямеччыны дык у іншых краінах яно ня лепш, а ў многіх краінах значна горш. Асабліва цяжкое і нявыноснае становішча рабочае моладзі у краінах Усходу, дзе моладзь складае асноўную масу пролетарыяту. Нават у Нямеччыне абсьледваньне ўстанавіла дзесяцігадзіны рабочы дзень падлетка на дробных прадпрыемствах. У Кітаі нармальны рабочы дзень пятнаццаці- шаснаццацігадовага пролетарыя працягваецца ня менш 12 гадзін, а на дробных прадпрыемствах і ў саматужнай прамысловасьці дасягае 16 і больш гадзін. Такое-ж становішча ў Індыі Іменна якраз Індыя праславілася тым, што у некаторыя гады сьмяротнасьць сярод радзіўшыхся дзяцей дасягала тут 80 проц.—учацьвёра болей нават у параўнаньні з царскай Расіяй, як вядома, стаяўшая у гэтых адносінах на „першым“ месцы. У Амэрыцы дванаццацігадзіны рабочы дзень падлетка —звычайная зьява.

Усё гэта надзвычайна падымае рэволюцыйную ролю моладзі. Пад ударамі крызісу прадпрыемца ўзмацняе націск перш за ўсё на рабочы маладняк. Жоўтыя профсаюзы і соцыялдэмократычныя партыі адмаўляюць у сваёй абароне моладзі і аддаюць яе ў лапы самой бязугрымнай эксплёатацыі. Сусьветная організацыя маладога соцыялфашызму СІМ прапаведвае адмаўленьне ад політычнага дзеяньня, займаецца ці голым культурніцтвам ці яшчэ часьцей—адкрытым штрэйкбрэхерствам, і ў мінуты баявых выступленьняў моладзі зьяўляецца на прадпрыемчым флянгу. У апошні час на гэтую організацыю капіталізм усклаў яшчэ больш адказную задачу—падрыхтоўку кадраў для будучай антысавецкай інтэрвэнцыі і СІМ, канчаткова адмовіўшыся ад усякага клопату аб становішчы прыдушанай крызісам моладзі, накіраваў усю сваю ўвагу на разбэшчаную антысавецкую пропаганду. Даволі таго факту, што II Інтэрнацыянал, з мэтай ідэйнага выхаваньня сваіх соцыял-недаросткаў, пасылаў ад'яўленых заправіл эміграцкага меншавізму, накшталт Абрамовіча, каб зразумець, што менавіта на СІМ ускладзе капіталізм надзеі, на організацыю, якая здольна падрыхтаваць байцоў і камандзіраў для будучых антысавецкіх армій.

Але надзеям гэтым ня суджана збыцца. Здрадніцкая роля СІМ з кожным днём становіцца ўсё больш яснай самым шырокім кадрам моладзі. Там, дзе організацыя комсамолу, пасьля рашэньняў пашыранага пленуму Выканкому КІМ, павярнуліся тварам да масавай работы, дзе комсамол практычна вядзе барацьбу за кіраўніцтва масавымі выступленьнямі маладога пролетарыяту, яму ўдаецца даволі шпарка выкрываць соцыялістычную організацыю моладзі, як простага пасобніка пастухоў прадпрыемцаў, правадніка фашызацыі пролетарыяту. У Нямеччыне, традыцыйнай крэпасьці СІМ, комсамолу, іменна ў выніку шырокай разгорнутай масавай работы, удалася ня толькі нанесьці СІМу рад жорсткіх політычных паражэньняў, аб'яднаўшы на аснове адзінага фронту зьнізу масы ня толькі комуністычнай, але і сімаўскай моладзі, але і ўдалося нанесьці гэтай штрэйкбрэхерскай організацыі рашучы ўдар: упяршыню ў гісторыі пролетарскага маладзёжнага руху комсамольская організацыя Нямеччыны, якая налічвае зараз звыш 50.000 членаў, аказалася ўпераді свайго праціўніка.

Посьпехі нямецкага комсамолу зьяўляюцца прыкладам для ўсіх комсамольскіх організацый сьвету. XVII МЮД павінен зьявіцца для сусьветнага комсамолу днём карэннага павароту ў бок масавай работы. Вопыт усесаюзнага комсамолу па організацыі мас моладзі вакол лёзунгаў соцыялістычнага будаўніцтва вопыт, шырока ўжыты ў Нямеччыне, павінен стаць вузорам комсамольскай работы ва ўсіх краінах.

На аснове лёзунгаў XVII МЮД'у —комсамол павінен стаць усюды масавай організацыяй моладзі, павінен нанесьці рашучы ўдар сваім фашысцкім і соцыял-дэмократычным праціўнікам.

XVII МЮД пройдзе пад знакам заваёў комсамольскім уплывам рашучых позыцый у масах маладога пролетарыяту.

Лeб.

Чатыры дні дэкады індустрыялізацыі

У ЦЭХАХ БЫТУ ЯШЧЭ НЯ ВІДАЦЬ КОМСАМОЛУ

ЯЧЭЙКА З КОНКРЭТНАЮ ПРАЦАЙ ІДЗЕ У РАБОЧЫ ПАСЁЛАК

Першыя дні дэкады індустрыялізацыі у трэцім рашаючым ужо далі конкрэтнае выяўленьне энтузіязму працоўных мас у прыгарадным колгасе, у цэху, у рабочым пасёлку.

Зусім слаба ўдзельнічаюць паасобныя комсамольскія ячэйкі у барацьбе за палепшаньне бытавых умоў працоўных. Комсамольская ячэйка яшчэ ня прышла ў рабочы пасёлак у рабочую кватэру з конкрэтнымі баявымі мерапрыемствамі.

У дэкаду індустрыялізацыі кожная комсамольская ячэйка павінна конкрэтна прававаць ва ўдарным цэху рабочага быту і дасягнутыя посьпехі замацоўваць надалей.

Палепшым культ-абслугоўваньне

8-га жніўня рабочыя фабрыкі „Комунарка" адпрацавалі дзень індустрыялізацыі ў колгасе „Санжан".

У зьвязку з дэкадай індустрыялізацыі, на фабрыцы ўзмацнілася праца па палепшаньню культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых.

Зараз на ф-цы адкрыта свая сталоўка. Распрацоўваецца проэкт пабудовы клюбу. Прыступлена да будаўніцтва інтэрнатаў для новых рабочых, інтэрнаты будуць пабудаваны ва ўдарным парадку.

Колектыў ЛКСМБ організуе скразную комсамольскую брыгаду, якая пераводзіцца на гаспадарчы разрахунак. Мякка шакаладны і карамельны цэхі перайшлі на зьдзельшчыну.

Казлоў.

ХРОНІКА ДЭКАДЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Сёньня 400 чалавек рабочых і моладзі заводу „Комунар" працуюць у прагарадных саўгасах і колгасах. Некаторая частка іх скарыстана ў горадзе па камунальнаму будаўніцтву.

600 рабочых фабрыкі „Усход" працуюць у колгасе „Вольна Праца".

Добры прыклад дапамогі прыгарадным гаспадаркам паказалі рабочыя друкарні імя Сталіна, яны апрацавалі ў прыгарадных гаспадарках „ДПУ", „Прабуджаная праца", „Новы сьвет".

Штодзённа з друкарні Сталіна працуе ў гэтых гаспадарках 50-70 чалавек.

Усяго за час дэкады пролетарскі Менск дасьць прыблізна 6000 працадзён соцыялістычнаму сэктару прыгараднага раёну Менску.

Каля 500 працадзён будуць скарыстаны на культурна-бытавым будаўніцтве рабочых кварталаў гораду.

Дзень індустрыялізацыі — на гаспадарчы разрахунак

Рабочыя і колектыў ЛКСМБ заводу „Дрэваапрацоўшчык" у час дэкады індустрыялізацыі працуюць у прыгарадным падшэфным саўгасе „Лекерта"

К дню індустрыялізацыі завод перавёў на гаспадарчы разрахунак усе цэхі

Д.



Комсамолія паказвае прыклад

На фабрыцы „Кастрычнік" (Менск), па пастанове сходу рабочых, праца ў прыгарадных гаспадарках будзе праводзіцца з 6-га па 16-е жніўня.

Комсамольскі колектыў зьвярнуў значную ўвагу на палепшаньне быту рабочых. Кожны дзень гэтай дэкады выхадная паходная ячэйка з выхаднымі рабочымі працуюць у саўгасе „Чырвоны Маяк". Тры пашыўных цэхі фабрыкі пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

М.—К.

Дамо сыравіну папяровым фабрыкам

Бракамолкі чакаюць стравы

Хто атрымае пераходны сьцяг?

„Чырвонай зьменай" створан штаб па збору макультуры і рызьзя

З мэтай забясьпечыць папяровыя фабрыкі БССР сыравінай, пры рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" створаны ўсебеларускі штаб па збору макулатуры і рызьзя.

У штаб увайшлі прадстаўнікі Белутылю, Белкоопутылю, Саюзпапеvры, Поліграфаб'яднаньня, друкарні імя Сталіна і „Зьвязды", ЦБ ДКА, „Піонэра Беларусі", Гаркому ДКА, Гарсавету, ЦК ЛКСМБ, Гаркому ЛКСМБ шпалернай фабрыкі, Белмалжывёлсаюзу і самапрамкоопэрацыі.

Для штодзённай опэрацыйнай работы штаб вылучыў спэцыяльную пяцёрку.

Зараз неабходна організаваць такія-ж штабы ва ўсіх гарадох, пры горкомах ЛКСМБ, у якія павінны ўвайсьці прадстаўнікі вышэйазначаных раённых організацый.

Да гэтага часу пры вясковых райкомах ЛКСМБ і сельсаветах існавалі групы садзейнічаньня збору макулатуры, але практычнай працы яны не праводзілі. Патрэбна тэрмінова ажывіць работу гэтых груп, увязаць яе з работай аддзяленьня Белутылю і Белкоопутылю і прыстасаваць да збору макулатуры і рызьзя.

Гэта праца павінна праходзіць не пакампанейску, а стаць баявой штодзённай работай кожнай комсамольскай ячэйкі, кожнага сельсавету.

Штаб пры „Чырвонай Зьмене" устанавіў пераходны сьцяг для раёну, які, разгарнуўшы масавую работу, прыцягне ўсю грамадзкасьць да збору макулатуры і рызьзя. Устаноўлены рад прэмій для сельсаветаў і зборшчыкаў.

Вялікую ролю ў выкананьні гэтай работы павінны адыграць піонэры. Першы дзень пачатку вучобы зрабіць усебеларускім днём паходу за збор макулатуры і рызьзя і адсюль пачаць штодзённую масавую працу па збору макулатуры,—баявая задача ўсіх піонэрскіх організацый.

Профсаюзы, гарсаветы і іншыя організацыі павінны прыняць актыўны ўдзел у забясьпечаньні папяровых фабрык сыравінай.

Шляхам організацыі спэцыяльных масовак, з прыцягненьнем да гэтай справы культурных і мастацкіх сіл, шляхам правядзеньня спэцыяльных гутарак на прадпрыемствах, стварэньня ларкоў для збору макулатуры патрэбна дамагчыся, каб кожны кілеграм паперы, кожная газэта, кожная анучка былі скарыстаны папяровымі фабрыкамі.

Толькі пры ўмове, калі ўся грамадзкасьць возьмецца за гэтую справу, мы здолеем забясьпечыць сыравінай нашы папяровыя фабрыкі.

Раённыя камітэты ЛКСМБ, сельсаветы, ячэйкі, школы, разгарнайце працу па збору макулатуры і рызьзя, цесна зьвязваецеся з усебеларускім штабам, змагайцеся за атрыманьне першынства, за атрыманьне пераходнага сьцягу!

Лес — будоўлі

Коопэрацыя „сплавіла" фонды сплаву

Засьпячэньне сплаўшчыка—ударны вучастак сплаўнага пляну

ГОМЕЛЬ — падвезена да пункту сплаву 59,2 проц. пляну. Пушчана ў сплаў 56 проц пляну.

БАБРУЙСК—падвезена да пункту сплаву 88,2 проц. Пушчана ў сплаў 45 проц. пляну.

ВІЦЕБСК — падвезена да пункту сплаву 60,2 проц. Пушчана ў сплаў 65 проц. да агульнага пляну.

МАЗЫР — падвезена да сплаву 64,8 проц. Пушчана ў сплаў 53 проц. да агульнага пляну.



Сплаўныя фонды злачынна разбазараны

Выкананьне пляну сплаву не забясьпечана на адным з важнейшых вучасткаў, на вучастку рабочага забясьпечаньня. Не гледзячы на вызначаны спэцыяльны фонд, сплаўныя вучасткі не атрымоўваюць вызначанай колькасьці прадуктаў.

Фонд спажывецкіх тавараў скарыстаны сплаўнымі вучасткамі толькі на 35—40 процантаў. Бабруйская, Барысаўская, Плешчаніцкая, Мазырская, мясцова-коопэрацыйныя організацыі разбазарылі фонды сплаву.

Значныя непаразуменьні ў організацыйнай працы мясцовых коопэрацый перашкаджаюць нормальнаму забясьпечаньню сплаўшчыкаў. Напрыклад, у Лепелі злучаны фонды леспрамгасу і сплаўнога вучастку. Леспрамгас, неправільна скарыстоўваючы свае фонды, у значнай частцы карыстаецца фондам сплаўнога вучастку.

Лясная сэкцыя Белкоопсаюзу зусім недастаткова кіруе забясьпечаньнем сплаву.

Вялікае разбазарваньне сплаўнога фонду спажывецкіх тавараў назіраецца ў Калінкавіцкім, Тураўскім, Петрыкаўскім і Лепельскім раёнах.

Невыкананьне пляну сплаву ў значнай меры тлумачыцца дрэннай працай коопэрацыі.

Да першага верасьня сплаў павінен быць скончаны. Тэрмін, які застаецца, патрабуе скарыстаць для поўнага выкананьня плянаў.

Каб забясьпечыць бальшавіцкую працу ў гэты тэрмін, праца коопэрацыі павінна быць тэрмінова перабудавана.

Ф.

З перадавых позыцый

2000 ТОН ТОРПУ ШТО ЗЕННА МОЖА ДАЦЬ АСІНТОРП

Сустрэча спажыўцоў, вытворцаў і пастаўнікоў павінна дапамагчы ў гэтым

„Пакажэце мне заметкі" патрабуе Белік

Асінторп павінен даць 121 тыс. тон торпу топкам Белдрэсу, каб забясьпечыць электраэнергіяй прамысловасьць Віцебшчыны, Магілеўшчыны і Аршаншчыны

На першае жніўня прамфінплян Асінторпу выканаваны па машынафармовачнаму торпу на 54,9 проц., па фрэзэрнаму на 9,4 проц. агульнае—ж выкананьне сэзоннага заданьня 37 проц.

Адсутнасьць конкрэтнага опэрацыйнага кіраўніцтва, гаспадарчага разрахунку, ураўнілаўка, абязьлічка і цякучасьць рабочае сілы прывялі Асінторп да глыбокага прарыву.

Выязная брыгада „Чырвонай Зьмены" і „Комсомольской Правды" на Асінторпе

Асінторп мае ўсе магчымасьці, каб у апошнія 18 дзён сэзону даваць па дзьве тысячы тон торпу. Патрэбна толькі рэалізаваць ратэньні ЦК КП(б)Б, СНК, пленуму ЦК ЛКСМБ і рабсельваенкораўскага зьезду. Спажыўцы і пастаўнікі абсталяваньня павінны яму дапамагчы ў гэтым.

У паход за лепшы барак, сталоўку, што праводзіцца выяздною брыгадай, павінны ўключыцца ўсе грамадзкія організацыі Асінторпу.

Бальшавіцкі дакумант не рэалізаваны

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК дала некаторы зрух у выкананьні і торпаздабычы. Так, на чацьвёртую пяцідзёнку ліпеня плян быў выканаваны на 69,2 проц., а ў апошнюю пяцідзёнку—на 73 проц. і недастатковы пералом тлумачыцца тым, што пастанова ЦК КП(б)Б на даведзена да кожнага рабочага.

Галоўныя пункты пастановы ня выкананы, машыны не пераведзены на трохзьменную працу, заводакіраўніцтва спасылаецца на об'ектыўныя прычыны. Гаспадарчы разрахунак не даведзены да машыны, цэху і брыгады. Прымацаваных рахункаводаў для машын няма.

Наркампрацы і Колгасцэнтр не забясьпечылі Асінторп новай рабсілай.

Такім чынам, асноўныя пункты пастановы ЦК КП(б)Б ня выкананы.

Рабочая сіла, якая прыбывае на Асінторп самацёкам, кідае працу, бо для яе ня створаны належныя культурна-бытавыя ўмовы.

На пасёлках няма вады, рабочыя заяўляюць; „Палепшыце харчаваньне, дайце вады, дайце магчымасьць культурна адпачыць—і мы выканаем прамфінплян".

Толькі зараз, па ініцыятыве выязнай рэдакцыі „Чырвонай Зьмены" і „Комсамольскай Правды", пачаўся паход за палепшаньне культурна-бытавых умоў рабочых тарпянікаў.

Опортуністы Белік заціскае самакрытыку

Няма рабкораў, няма каму тварыць газэту",—гаварылі на Асінторпе опортуністыя. На пасёлках ля машын ня было насьценгазэт.

Гэта тлумачылася і тым, што сэкратар партколектыву тав. Белік прапанаваў пры выпуску якой-небудзь газэты „не прапускаць заметак на комуністых, без узгадненьня з партколектывам, бо гэта падарве іх аўторытэт".

Такі яўны факт заціску самакрытыкі не атрымаў належнага адпору з боку парторганізацыі да прыезду выязнай брыгады.

І толькі, калі выязная брыгада выпусьціла 12 нумароў радыё газэты, калі дзякуючы рэалізацыі рашэньняў рабсельваенкораўскага зьезду, на кожным пасёлку былі створаны насьценгазэты, якія зьяўляюцца сапраўднымі сарацьбітамі за выкананьне прамфінпляну, за рэалізацыю пастаноў ЦК КП(б)Б, СНК, пленум ЦК ЛКСМБ і рабсельваенкораўскага зьезду,—толькі тады кіраўніцтва Асінторпу пераканалася ў наяўнасьці рабкораў на заводзе.

Да канца торпсэзону засталось 18 дзён.

Рэалізацый рашэньняў ЦК КП(б)Б і СНК мы павінны дабіцца штодзённай выпрацоўкі 2-х тысяч тон торпу.

Нашым стымулам павінна стаць: 36 тысяч тон да канца сэзону.

Вывазка, уборка і сушка торпу не забясьпечана. Замест 400—500 ваганэтак, вывозіцца толькі 130—200. Патрэбна і ў гэтым напрамку дабіцца рашучага пералому. На Асінторпе для гэтага ўсе магчымасьці. Патрэбна толькі практычна рэалізаваць усе рашэньні.

Сустрэча спажыўцоў вытворцаў і пастаўнікоў абсталяваньня, якую організуюць „Комсамольская праўда" і „Чырвоная Зьмена", акажуць вялікую дапамогу ў выкананьні плянаў Асінторпу.

М. Плашчынскі.

Пастанова пленуму ЦК ЛКСМБ ня выканана

Пасьля пастановы пленуму ЦК ЛКСМБ аб рабоце торпапрамысловасьці, сярод паасобных комсамольскіх організацый ня створаны пералом у гэтым напрамку.

На Асінторп павінна было прыбыць 465 чалавек мобілізаваных комсамольцаў. Аднак, Віцебскі, Магілеўскі, Жлобінскі, Рагачэўскі, Талочынскі і Чэрыкаўскі раёны ня прыслалі ніводнага. Аршанскі, замест 100 чалавек, прыслаў 10, Шклоўскі з 34 прыслаў 3-х, Лёзна, замест 15, прыслала 1 і г. д. Ніводзін раён разьвёрсткі ЦК ня выканаў.

Крупскі раён умудрыўся даць тэлеграму аб высылцы чалавека за мобілізаванымі комсамольцамі. Калі той прыехаў, дык кіраўнікі райкому паслалі яго праводзіць мобілізацыю па раёне, ня ўлічыўшы таго, што зараз на торпазаводзе кожны чалавек дораг.

Мы просім ЦК комсамолу прыняць належныя захады да раёнаў, каб яны выканалі кантрольныя лічбы разьвёрсткі па мобілізацыі комсамольцаў на торпазаводы.

Рэйд брыгад „Чырвонай Зьмены“

Да новага навучальнага 22 ДНІ

Ударнікаў варштатаў—на фронт вучобы!

Хутчэй ліквідаваць вузкае месца набору—забясьпечыць пэдустановы рабочай праслойкай

Політэхнікум да навучальнага падрыхтаваны

Агульная колькасьць асоб, якія павінны быць прыняты ў Політэхнікум—450, і у вячэрні—270, на дарожна-архітэктурнае аддзяленьне—150 і горнае аддзяленьне—30 асоб.

З 400 паданых заяў, каля 70 проц. прыпадае на рабочых. Праз студэнтаў, якія працуюць на практыцы, праводзіцца вярбоўка ў Політэхнікум. Апрача таго, працуюць падрыхтоўчыя курсы на 300 чал. набраных выключна з вытворчасьці

Студэнты на 70 проц. забясьпечаны інтэрнатамі. Будуецца новы інтэрнат і рамантуюцца старыя да пачатку навучальнага году яны будуць скончаны. Навучальныя пляны ўжо складзены, згодна дырэктыў Наркомасьветы. Для праходжаньня практыкі, складзены дагаворы з усімі будаўнічымі прадпрыемствамі Менску. Навучальнымі прыладамі і падручнікамі тэхнікум забясьпечаны. Аўдыторыі, лябораторыі і майстэрні поўнасьцю абсталяваны. Не хапае выкладчыкаў спэцыяльных дысцыплін, на якіх паданы запрос у Наркомасьветы.

Брыгада „Чырвонай Зьмены“:
А. Гуло, Х. Ідлынко.

Набор не забясьпечаны

Па разьвёрстцы НКА, Польпэдтэхнікум павінна прыняць ў восеньні набор 80 чалавек.

Зараз працуюць падрыхтоўчыя курсы на 22 чал. Заяў падана толькі дзьве. Зусім мала дзяцей рабочых, а рабочых усяго 1 чалавек. Для ўкомплектаваньня тэхнікуму адм'ністрацыя дагэтуль нічога не рабіла. Толькі мяркуюць яшчэ пасланць вярбовачныя брыгады.

Брыгада „Чырвонай Зьмены„
Глайхенгаўз. Беленкая

Навучальныя пляны яшчэ не абгавораны

Хэмтэхнікум у асеньні набор павінен прыняць 150 чалавек, а заяў 170. Тэрмін падачы 20-га жніўня. Пераважная колькасьць па соцыяльнаму складу—дзеці рабочых. Зусім мала саміх рабочых. Па ўкомплектаваньню тэхнікуму працуе брыгада. Пры тэхнікуме працуюць падрыхтоўчыя курсы на 28 асоб.

Студэнты покуль не забясьпечаны інтэрнатам, але ён ужо будуецца. Навучальныя пляны яшчэ не абгавораны. Пісьмовымі прыладамі тэхнікум забясьпечаны, а падручнікамі у невыстарчальнай колькасьці. Фізычнага габінэту няма. Патрэбная колькасьць выкладчыкаў у тэхнікуме ёсьць.

Брыгада „Ч З.“ **Гэйштэйн і Рутэнбэрг.**

Узмацніць рабочую праслойку

У асеньні набор менскі Белпэдтэхнікум павінен прыняць 120 чалавек. Падана 170 заяў. Па соцыяльнаму складу большасьць колгасьнікі і толькі 10 чал. рабочых. Навучальныя пляны складзены, аўдыторы абсталяваны, але плошча іх не адпавядае запатрабаваньням студэнтаў. Прыладамі і падручнікамі тэхнікум таксама забясьпечан. Інтэрнатам студэнты забясьпечаны толькі на 65 проц.

Значны недахоп у выкладчыках па грамадазнаўству, фізыцы, літаратуры, замежнай мове і інш.

Наркомасьветы і комсамол не павінны дапусьціць зрыву навучальнага ў менскім Белпэдтэхнікуме.

Брыгада „ЧЗ“:
Пінчук, Штафінская.

З інтэрнатам ня вырашана

У асеньні набор БДУ павінна прыняць 90 чалавек.

На фізыка-матэматычнае аддзяленьне 60 чал і на хэмічнае 30 чал Заяў падана 48. Для вярбоўкі студэнтаў былі пасланы брыгады. Высьвілася, што рабочыя ня жадаюць ісьці у БДУ з прычыны дрэннага забясьпечаньня студэнтаў.

Выкладчыкамі і падручнікамі БДУ забясьпечаны нявыстарчальнай колькасьці.

З інтэрнатам справа ня вырашана.

БДУ стаіць пад пагрозаю зрыву навучальнага. Партыйная і комсамольская арганізацыі БДУ не павінны гэтага дапусьціць.

Брыгада „ЧЗ“ **Грынгауз Вайнштэйн.**

Комсамольскі пост даносіць

ЗВОДКА

аб становішчы політпадручнікаў на 5-VIII 1931 г.

№ заказаў	Тыраж і лістаж	Аўтар	Назва заказу	У якім стане
НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ:				
803	3×20	Быхаўскі	Дыял. матэрыялізм	Пераплятаецца
1044	25×10	Папоў	Гісторыя УсеКП(б) ч. II.	„
765	25×20	„	„ ч. I.	„
1126	40× 4½	Рубін	Гісторыя кляс. барацьбы	Вярстаецца
1086	5× 5½	„	Ад гуртка да РСДРП	Набіраецца
1529	25×16	Пакроўскі	Руская гісторыя ч. I і II	„
1541	7×16	Валасевіч	Гісторыя УсеКП(б)	„
НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ:				
22	3×20	Агурскі	Гісторыя рэвол. руху	Набрана, чакае прадмовы ад аўтара
112	4×15	Загабрынскі	Гісторыя матэр.	Набрана, чакаецца канец ад аўтара
125	3× 5	Лепяшынскі	Пра гасп. конф.	Пераплятаецца
1148	3× 2	Шэловіч	XVI зьезд УсеКП(б)	Набіраецца
1375	6×12	Каган	Грамадазнаўства	Вярстаецца

Комсамольскі пост наборнага аддзяленьня друкарні імя Сталіна

Выязная рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“

Фронт уборкі тэхнічных культур прарваны

Дрысенскі раён вінавайца ганебнага прарыву па ільнаўборцы

Матар'ял аб стане ўборкі. апрацоўкі і здачы лёну дзяржаве па Дрысенскаму раёну і аб будаўніцтве Варкоўскага ільназаводу ёсьць папярэджваючы сыгнал, які прымушае нас біць трэвогу.

Падрыхтоўка да ўборкі тэхнічных культур па Дрысенскім раёне ганебна зрываецца. Райколгассаюз і Райкоопільнаводсаюз безадказным адносінамі ставяць уборку тэхнічных культур пад рэальную пагрозу зрыву.

Ёсьць пагроза, што спыніцца ільназавод, які пачаў працу, і затрымаецца сваячасовы пуск двух новых.

Дрысенская комсамольская арганізацыя павінна напрудзіць усе свае сілы, каб папярэдзіць зрыў уборкі тэхкультур—сыравінную базу ільназаводаў, і сваячасова пусьціць у эксплёатацыю новых.

Комсамольскія арганізацыі ільнаводных раёнаў жывым опэрацыйным кіраўніцтвам, мобілізацыяй грамадзкасьці павінны забясьпечыць сваячасовую ўборку лёну.

Трывожныя сыгналы з Дрысы

Бальшавіцкія тэмпы ўборцы тэхнічных культур

Дрысенскі р-н зьяўляецца спэцыялізаваным раёнам па тэхнічным культурам. У раёне 162 колгасы, 2 саўгасы і 2 комуны. На колгасным сэктары раён павінен убраць 3250 га лёну і па індывідуальным 2343 га.

Усё гэта вымагае ад раённых організацый Дрысеншчыны бальшавіцкай падрыхтаванасьці да ўборкі лёну, сустрэчы яе ва ўсеузброеньні. Аднак, праца па падрыхтоўцы да ўборкі тэхкультур у райколгассаюзе і райкоопільнаводсаюзе праходзіць самацёкам.

Пляны ўборкі тэхнічных культур, з устанаўленьнем тэрмінаў яе сканчэньня, РКС даў колгасам толькі 29 ліпеня, тады, як уборка лёну ў некаторых колгасах ужо распачата.

Райколгассаюз ня ведае, якія машыны патрэбны раёну для ўборкі тэхнічных культур, якія машыны ўжо ёсьць і як праходзіць іх рамонт. Райколгассаюз ня ведае аб тым, як колгасы падрыхтаваны да ўборкі лёну. Вучот патрэбнай для ўборкі рабочай сілы не наладжан. Для організацыі ўборкі лёну ў аднаасобным сэктары райкоопільнаводсаюз нічога ня робяць, і 2343 га лёну знаходзяцца па-за яго ўвагай. Пляны ўборкі, апрацоўкі і здачы ільна-валакна не выпрацаваны яшчэ не праведзена ацэнка ўраджаю лёну па кантракцыйны дагаворам. Каб забясьпечыць паступленьне лёну з незакантрактаванай плошчы райкоопільнаводсаюз ніякіях мер ня прыняў.

Райкоопсаюз і райкоопільнаводсаюз безадказнай працай па ўборцы ставяць пад пагрозу зрыву ўборачную кампанію тэхкультур; з-за адсутнасьці сіравіннай базы можа стаць ільназавод і затрымацца сваячасовы пуск двух новых ільназаводаў.

КСМ Дрысеншчыны яшчэ не зразумеў, што галоўная задача зараз, гэта—барацьба за лён, за яго хутчэйшую ўборку, апрацоўку і здачу дзяржаве. РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ не забясьпечылі бальшавіцкага кіраўніцтва падрыхтоўкаю да ўборкі і яе правядзеньнем

Комсамол Дрысеншчыны павінен абвясьціць месячнік штурму прарываў, на працягу якога неабходна забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы ўборкі, апрацоўкі і здачы лёну дзяржаве.

Казлоў, Канончык.

Ліквідаваць абязьлічку і цякучасьць рабсілы

Тэрмін заканчэньня будаўніцтва Барковіцкага ільназаводу мяняліся ўжо тры разы. Зараз ўстаноўлен апошні тэрмін: 1-га кастрычніка 1931 году. Аднак, узятыя зараз тэмпы ставяць пад наяўную пагрозу аканчэньне будаўніцтва к. вызначанаму тэрміну.

Будаўніцтва не забясьпечана патрэбнай колькасьцю рабочай сілы. Зараз працуе 60 чалавек, але гэта недастаткова патрабуецца яшчэ 50 чал.

Колгас „Клімаўшчына“ злосна супраціўляецца выкананьню пастановы партыі аб забясьпечаньні важнейшых вучасткаў будаўніцтва рабсілай з ліку колгасьнікаў. Ён ужо два тыдні абяцае прыслаць чатырох колгасьнікаў на будаўніцтва, але толькі абяцае.

На будаўніцтве не ліквідавана абязьлічка. Соцспаборніцтвам ахоплены толькі каменшчыкі, якія паказвалі сапраўдны ўзор бальшавіцкай работы.

Цякучасьць рабочай сілы на будаўніцтве дасягае 50 проц. Галоўная прычына цякучасьці—не наладжанае харчаваньне

Галавацяпы з дрысенскага Сельпо ігнаруюць пастанову партыі аб палепшаньні забясьпечаньня будаўнічых вучасткаў харчаваньнем. Часта рабочыя па 4-5 дзён сядзяць бяз хлеба. 70 віцебскіх рабочых кінулі ўжо працу.

Комсамольская ячэйка комуны „Новая культура“, якая абслугоўвае ільнавод, ходам будаўніцтва ня цікавіцца, таксама як і райком комсамолу.

Белдзяржснаб не забясьпечыў будаўніцтва ільназаводу цьвікамі і толем, з-за адсутнасьці гэтых матарялаў прыходзіцца спыняць працу.

Комсамольская організацыя Дрысеншчыны павінна павярнуцца тварам да будаўніцтва ільназаводу.

Казлоў, Канончык.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599